# Код памяці

Дрэвы забылі пра буры і страты,
Раны свае загаіла зямля.
Толькі нічога забыць не змагла ты,
Памяць мая!..

Максім Танк.

З цягам часу многія падзеі і факты становяцца менш яркімі, некаторыя зусім сціраюцца з памяці. Але ёсць рэчы, якія забыць немагчыма…

Памятую сваю прабабулю ў белай хустачцы, заўсёды з лагоднай усмешкай, з іскрынкай у вачах. Яна спрытна завіхалася ля печы, а пасля, як у казцы, на стале з’яўляліся пышныя бліны, смачная яечня, непаўторная каша ў чыгунку. Жвавая, вясёлая, прабабуля паспявала ўсё рабіць і ў хаце, і на агародзе. А колькі яна перажыла на сваім вяку, я, тады яшчэ несвядомая дзяўчынка, зусім не ведала. Лічыла прабабулю Лізавету вельмі моднай, бо бачыла ў яе на руцэ татуіроўку, хоць і ледзь прыкметную. Калі я запытала, што абазначаюць гэтыя размытыя лічбы, прабабуля цяжка ўздыхнула, ласкава прытуліла мяне да сябе і сказала, што надыдзе час і яна ўсё растлумачыць.

Прайшлі гады. З урокаў гісторыі, літаратуры, з мастацкіх фільмаў мне ўжо даўно стала зразумела значэнне слова “генацыд”. Нелюдзі планамерна вынішчалі мірных жыхароў Беларусі, не шкадавалі ні старога, ні дзіцяці. Ад нацыстаў нельга было чакаць чалавечнасці: яны не ведалі, што гэта такое.

Наведваючы прабабулю чарговы раз, я пачала размову пра яе ваеннае дзяцінства, пра загадкавы “код” на руцэ і ўпершыню пачула ад непасрэднага ўдзельніка тых жахлівых падзей пра нечалавечыя зверствы нацыстаў.

*“...Мая татуіроўка – гэта частка мяне, гэта памяць пра тое, што прыйшлося перажыць…*

*…Страшэнным крыкам і плачам было напоўнена паветра. Усіх сабралі ў школе. Гналі некалькі тыдняў. Мы ішлі амаль босыя па мёрзлай зямлі. Дарога была доўгай, а смех фашыстаў – здзеклівым… А пасля – рады калючага дроту, вартавыя вышкі, спецыяльна выдрэсіраваныя сабакі.*

*...Нам загадалі раздзецца і ісці ў лазню. Душа ўзрадавалася: нас чакае цёплая вада і мыла!.. Вада была халоднай. Ледзяной. Дзеці крычалі і ўцякалі, іх білі. Мы з Волечкай проста стаялі пад бруямі вады. Я не адчувала ні рук, ні ног…”*

Прабабуля некалькі хвілін сядзела нерухома, гледзячы скрозь мяне. У пакоі павісла мёртвая цішыня. Было чуваць, як калоціцца яе сэрца… Нібы пражываючы гэтыя моманты зноў, прабабуля працягвала:

“*…Волечцы, маёй сястрычцы, было толькі чатыры гады…*

*Нас, старэйшых дзяцей, пастроілі і павялі. Пайшла Лізавета, назад вярнулася – нумар*****. Нам забаранілі вымаўляць нашы імёны, трэба было паказваць толькі руку з нумарам.*

*Маленькім дзеткам нумары выпальвалі на пятачках. Волечцы нумар не паставілі... Раніцай прыйшла жанчына з вялікім кошам і вынесла з нашага дзіцячага барака некалькі задубелых дзяцей. Волечка ляжала зверху... Яна да гэтага часу мне сніцца...*

*Спалі на мокрай саломе... Білі ў любы момант і без усялякай прычыны... Кроў бралі часта, а раніцай многія не прачыналіся... Дзеці "сыходзілі" хутка, іх проста "выпівалі" і выкідалі...*

*Старэйшыя тлумачылі малодшым, што нельга браць у "добрага" доктара цукерку, бо там атрута, але салодкая спакуса часта брала верх...*

*Хутчэй за ўсіх паміралі тыя, хто быў донарам скуры для нямецкіх афіцэраў. Пасля аперацыі яны не пражывалі і тыдня..."*

Я слухала прабабулю і разумела, што нават у жудасным сне не хачу ўявіць сябе на месцы тых дзяцей, што прайшлі праз канвеер смерці. Калі яна закончыла свой цяжкі аповед, сядзела моўчкі, толькі вялікія слёзы кацілісяпа нязвыкла бледным твары, бо зверствы фашыстаў моцна ўрэзаліся ў памяць.

Хто дазволіў нацыстам дзяліць насельніцтва на расы? Чаму адны лічылі, што могуць уладарыць над астатнімі, падпарадкоўваць іх сабе і нават знішчаць? Адкуль з'явілася канцэпцыя "расавай гігіены" ?

Калі я з дзяцінства была абласкана любоўю бацькоў, то мая прабабуля, тады 11-гадовая Ліза, бачыла, як замярзае на марозе матуля, прывязаная фашыстамі да яблыні за тое, што прасіла не забіраць апошнюю бульбу. Калі я любіла амаль штодзень мяняць нарады, то Ліза ўсе тры гады ў канцлагеры прахадзіла ў дзіравых бацінках і "дарослым" паліто, не здымаючы ўсё гэта нават летам. Калі кожную раніцу мяне будзіў пацалунак матулі і яе ласкавы голас, то Ліза чула крыкі катаў. Калі я мела магчымасць выбіраць ласункі на свой смак, то мёрзлая бульба, цвілы кавалачак хлеба, суп на бацвінні здаваліся ёй найлепшымі прысмакамі.

Нехта можа задацца пытаннем: навошта зараз трэба варушыць мінулае, вярэдзіць зарубцаваную рану, нанесеную як усёй краіне, так і людзям, што прайшлі праз катаванні фашыстаў? А як можна забыць тое, што на тэрыторыі толькі нашай краіны было створана больш за 260 лагераў смерці і месц масавага знішчэння людзей?! Я ўпэўнена, што гэта трэба ведаць, каб не дапусціць нідзе прапаганды і рэабілітацыі нацызму. Генацыд не мае тэрміну даўніны.

Для ўшанавання памяці нявінна забітых і абароны праўды для жывых з'яўляецца ўнікальная па змесце кніга "Генацыд беларускага народа", у якой сабраны даведніцка-аналітычныя і дакументальныя звесткі з угалоўных спраў. Праз гады выявіць дасканалыя факты будзе яшчэ цяжэй: нас пакідаюць апошнія

сведкі і відавочцы тых жудасных падзей (на жаль, толькі 273 вязні канцлагераў дажылі да гэтага дня ў Магілёве).

Злачынствы супраць чалавечнасці не павінны паўтарацца. Бацькі, педагогі, законы маралі і праваслаўя вучаць нас дараваць, але забываць мы не маем права. Ніколі! Ніколі! Ніколі!